ТАЯМНІЦЫ І АДКРЫЦЦІ

Бяспечна есці

АРЭХІ ДЛЯ СЭРЦА І СУПРАЦЬ РАКУ

Грэцкія арэхі з'яўляюцца самым карысным прадуктам для здароўя сэрца. Такую думку выказала доктар медыцынскіх навук у Гарвардскай школе грамадскай аховы здароўя Марта Гуаш Ферэ ў інтэрв'ю газеце La Vanguardia.

«Розныя даследаванні паказалі, што грэцкія арэхі могуць абараняць ад захворванняў сэрца за кошт паляпшэння ліпіднага профілю», — расказала Ферэ. Па словах навукоўца, іх вылучае сярод іншых вялікая колькасць альфа-ліналенавай кіслаты. Яна ўяўляе сабой амега-3 тлустую кіслату, падобную на тую, што ўтрымліваецца ў рыбе.

Таксама эксперт адзначыла супрацьзапаленчыя і антыаксідантныя ўласцівасці прадукту. Пасля ўжывання грэцкіх арэхаў паляпшаюцца і паказчыкі халестэрыну.

Раней ужо паведамлялася пра шэраг іншых карысных для арганізма ўласцівасцяў гэтых арэхаў. Так, даследчыкі з Універсітэта Маршала (ЗША) прыйшлі да высновы, што спажыванне іх у колькасці ўсяго 57 грамаў у дзень можа стрымаць рост пухліны пры пацверджаным раку малочнай залозы.

Пры гэтым празмернае спажыванне арэхаў пагражае праблемамі са здароўем. У чалавека, які з'еў за раз адзін і больш кілаграмаў, магчыма развіццё кішачнай непраходнасці — пагрозлівага для жыцця стану. Усім, хто мае праблемы з лішняй вагой або спрабуе знізіць масу цела, навукоўцы рэкамендуюць устрымацца ад пераядання арэхаў і ўжываць прадукт у першай палове дня.

Дыетолагі адзначылі, што страва, у якую часцяком дадаюцца грэцкія арэхі, утрымлівае ў сабе каля 1,5 тысячы кілакалорый. Гэта практычна роўна дзённай норме кілакалорый для чалавека, які імкнецца скінуць лішнюю вагу.

Варушы звілінамі!

СІЛА МОЗГА — ВЫНІК ВОЛІ

Амерыканскія навукоўцы высветлілі, што найлепшым спосабам падтрымаць кагнітыўныя здольнасці мозга для людзей, старэйшых за 30 гадоў, з'яўляецца разнастайная дзейнасць. Высновы навукоўцаў апублікавала выданне The Journals of Gerontology.

На думку спецыялістаў, мозг пастаянна павінен адчуваць нагрузку, бо гэта дзейсны спосаб спыніць яго старэнне. Па словах даследчыкаў з Універсітэта Паўднёвай Фларыды, на працягу дня чалавек можа займацца рознымі справамі: гатаваннем, работай, ядой, праглядам тэлевізара, чытаннем кніг, спортам, але для добрай загрузкі мозга гэтага недастаткова. Таму чым больш задач чалавек сабе паставіць, тым больш актыўны і здаравейшы будзе мозг.

Высновы навукоўцаў пацвярджаюць вынікі маштабных даследаванняў з удзелам 732 чалавек ва ўзросце ад 34 да 84 гадоў. Гэтая ж група была апытаная праз дзесяць гадоў. Людзі, якія вывучалі нешта новае на пастаяннай аснове, у тым ліку замежныя мовы, дэманстравалі лепшыя кагнітыўныя здольнасці, чым паддоследныя, якія руцінна праводзілі час.

Па словах экспертаў, шматпланавая штодзённая актыўнасць дазваляе назапасіць інтэлектуальныя і сацыяльныя навыкі, а жыццёвы вопыт — адукацыя або вольны час — можа дапамагчы кампенсаваць прагрэсуючую хваробу Альцгеймера. Акрамя таго, гэта станоўча ўплывае на аб'ём рабочай памяці, бегласць маўлення, увагу, вербальную памяць, хуткасць апрацоўкі інфармацыі і мыслення.

Грыва, як у льва

АБАРАНЯЕ БАРАДА НЕ ТОЛЬКІ Ў ХАЛАДЫ

Навукоўцы знайшлі адказ на пытанне, чаму ў мужчын з'явілася барада. Даследчыкі заўважаюць, што густыя валасы на твары нездарма асацыююцца з маскуліннасцю, агрэсіяй і сацыяльным дамінаваннем. У ходзе эвалюцыі чалавечага віду ў мужчын яна магла з'явіцца для абароны падчас боек. Такую выснову зрабілі аўтары новага даследавання.

У мінулым даследаванні дапускалі, што барада магла служыць для абароны важных частак цела, такіх як сківіца і горла, ад нападаў, тым самым паўтараючы функцыю грывы ў ільвоў, тлумачаць навукоўцы з Універсітэта Юты. Зразумела, што ніжняя сківіца часта становіцца той часткай твару, якая больш за ўсё пакутуе падчас боек. Як і ў іншых відаў вялікіх малпаў, чалавечыя самцы больш звяртаюцца да гвалту, у асноўным супраць іншых асоб мужчынскага полу. Калі яны б'юцца, то часта цэляць у твар. Гэта можа растлумачыць, чаму структура апошняга ў мужчын і жанчын сфарміравана па-рознаму. Таму аўтары выказалі здагадку, што тоўстае покрыва валасоў магло эвалюцыйна з'явіцца для таго, каб паглынаць і змякчаць удары ў твар.

Каб праверыць сваю гіпотэзу, каманда навукоўцаў стварыла мадэль чалавечай касцявой тканкі і выразала з яе прамавугольнік памерамі 60 х 65 х 3 міліметра. Пасля гэтага яны накрылі костку пластом авечай скуры з поўсцю. Скура была прасякнута вадкасцю, каб яна нагадвала жывыя тканкі. А поўсць засталася сухой. Навукоўцы прызнаюць, што авечая скура і поўсць не вельмі падобныя на чалавечую бараду. Аднак у іх не было магчымасці «атрымаць узор чалавечага паходжання».

З дапамогай адмысловай машыны даследчыкі кінулі на імправізаваную бараду прадмет вагой 4,7 кілаграма з вышыні 7,4 сантыметра — нібыта гэта ўдар у твар. Працэс паўтарылі для 20 узораў авечай скуры. У сярэднім узоры з поўсцю паглыналі на 30 працэнтаў больш энергіі, чым лысыя або з невялікім валасяным покрывам.

«Вынікі гэтага даследавання паказваюць, што валасы сапраўды здольны ў значнай ступені скараціць уплыў удару і паглынуць энергію, а такім чынам скараціць частату шкоды. Калі гэта ж самае адбываецца з чалавечымі валасамі на твары, тады густое покрыва можа дапамагчы абараніць уразлівыя часткі пярэдняй вобласці чэрапа ад сакрушальных удараў, у прыватнасці сківіцу», — лічаць аўтары даследавання. «Барада таксама можа скараціць раненні, разрывы і траўмы скуры і цяглі твару», — дадаюць яны. Такім чынам, барадатыя мужчыны маюць перавагу ў бойцы. І таму наяўнасць такога покрыва заахвочвалася натуральным адборам у ходзе эвалюцыі.

Сяргей СТАРЫНАЎ.
Фота з адкрытых крыніц.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Калі агрэст на вашай дачы расце даўно, куст дастаўся вам ад бабулі, а яна ў свой час брала парасткі ў прабабулі, хутчэй за ўсё праблема мучністай расы знаёмая вам не па чутках. Гэты белаваты налёт на лісці і сцёблах, карычневыя плямы на ягадах, якія счышчаюцца, калі пастарацца, але прыемнага ўсё адно мала.

ЯК ПАЗБАВІЦЦА АД МУЧНІСТАЙ РАСЫ НА АГРЭСЦЕ

Старыя сарты добрыя тым, што смачныя і адназначна не падвяргаліся ніякім мадыфікацыям, але вось бяда — яны зусім няўстойлівыя да розных хвароб. Пазбаўляцца ад смачнага сорту не хочацца, а вось перамагчы мучністую расу — наадварот. Пры гэтым добра было б абысціся без таксічных пестыцыдаў. Эфектыўныя народныя сродкі прафілактыкі і барацьбы з мучністай расой ёсць. І яны праверены на практыцы.

Выклікае захворванне адпаведны род грыбкоў, якія выкідваюць споры двойчы: вясной і летам. Таму на добры толк трэба праводзіць тры апрацоўкі агрэсту ад мучністай расы: да цвіцення, адразу пасля цвіцення і перад лістападам. Пры гэтым кусты лепш не апырскваць, а намочваць, імкнучыся не прапусціць ні адной галінкі. Да таго ж важна памятаць, што споры грыба зімуюць у падсцілцы, таму абавязкова трэба паліць тым жа самым сродкам і зямлю вакол куста. Апрацоўку рэкамендуецца праводзіць вечарам.

Народныя сродкі ад мучністай расы на агрэсце

Аміячная салетра. 50 грамаў аміячнай салетры раствараюць у 10 літрах вады. Апрацоўваюць агрэст пасля цвіцення.

Аспірын + сода. 1 ст. л. соды, 1 таблетка аспірыну, 1 ч. л. сродку для мыцця посуду або вадкага мыла, 1 ст. л. алею раствараюць у 4,5 літра вады. Гэтым саставам кусты апрацоўваюць на працягу сезона адзін раз у два тыдні.

Вада. Ваду варта давесці да кіпення. Ранняй вясной да сходу снегу кусты агрэсту абліваюцца кіпенем проста з палівачкі.

Гаупсін або трыхадэрмін (біяпрэпараты). 150 мл прэпарату раствараюць у 10 літрах вады. Апырскваюць агрэст на працягу перыяду вегетацыі з інтэрвалам у два тыдні.

Попел. Адзін кілаграм попелу заліваюць 10 літрамі вады і настойваюць сем дзён, часам памешваючы. Затым асцярожна пераліваюць настой, пакідаючы асадак на дне. Апырсканне праводзяць у канцы мая — пачатку чэрвеня тройчы з інтэрвалам у адзін дзень. Попелавы асадак разводзяць вадой і паліваюць гэтай сумессю глебу пад кустамі.

Кальцыніраваная сода. 50 г кальцыніраванай соды раствараюць у невялікай колькасці гарачай вады, затым даводзяць ваду да 10 літраў і дадаюць 10 г вадкага мыла. Апрацоўваюць агрэст двойчы: да цвіцення і пасля цвіцення.

Кефір або скіслае малако, сыроватка. 1 літр кефіру або кіслага малака змешваюць з дзевяццю літрамі вады. Апрацоўку праводзяць тры разы праз кожныя тры дні.

Каравяк. Каравяк разводзяць вадой у прапорцыі 1:3 і настойваюць тры дні. Затым зноў разводзяць вадой 1:3 і працэджваюць. Апрацоўваюць агрэст да цвіцення, пасля цвіцення і перад лістападам.

Цыбульныя шалупіны. 200 г шалупін рэпчатай цыбулі заліваюць 10 літрамі кіпеню і настойваюць два дні. Апрацоўваюць агрэст да цвіцення, пасля цвіцення і перад лістападам.

Піжма. 30 г сухой піжмы заліваюць 10 літрамі вады і настойваюць суткі. Затым вараць на працягу 1,5—2 гадзін і працэджваюць. Адварам піжмы апрацоўваюць зямлю вакол кустоў вясной і восенню.

Прэлае сена ці лясны подсціл. Вядро на траціну запаўняюць сенам, даліваюць вадой і настойваюць тры дні. Потым зноў разводзяць вадой 1: 3 і працэджваюць. Апрацоўваюць агрэст да цвіцення, пасля цвіцення і перад лістападам.

Сода. 2 ст. л. соды і 50 грамаў дзёртага гаспадарчага мыла раствараюць у 10 літрах вады. Апрацоўваюць кусты двойчы: да цвіцення і пасля цвіцення.

Угнаенні. На 10 літраў вады неабходна 20 г суперфасфату, 50 г хлорыстага калію, 30 г мачавіны, 5 г марганцоўкі. Агрэст апырскваюць адзін раз пасля цвіцення.

Фітаспарын. Бяруць 100—150 мл прэпарату на 10 літраў вады. Апрацоўваюць куст і глебу пад ім увесну да цвіцення і восенню пасля плоданашэння.

Хвошч. 1 кг свежага хвашчу заліваюць 10 літрамі вады і вараць дзве гадзіны. Адвар астуджваюць, працэджваюць і разводзяць вадой 1:5. Апырскваюць агрэст на працягу дачнага сезона з інтэрвалам у тыдзень.

Варта памятаць, што мучністая раса, як і многія іншыя грыбковыя захворванні, вельмі любіць вільготнасць, загушчаныя пасадкі і бедныя арганікай глебы. Таму, па-першае, трэба старацца рэгулярна выразаць старыя галінкі, якія дрэнна пладаносяць, каб паветра свабодна пранікала ўнутр куста, а па-другое, аздараўляць і ўзбагачаць глебу арганікай. Замест таго каб перакопваць пад кустамі, выполваць усё пустазелле і выдаляць подсціл (а раптам там стаіўся грыбок?), лепш, наадварот, падкладаць пад агрэст бацвінне (асабліва добрае бацвінне паслёнавых: бульбы і таматаў) і шчодра паліваць яго зверху растворам ЭМ-прэпаратаў. Карысныя мікраарганізмы хутка возьмуцца за справу і «зжуюць» арганічныя рэшткі разам з хваробатворнымі грыбкамі.

Спытайце пра радзіннае

Навошта па вёсцы свечку носяць?

«Аднойчы чула ад маці, якой ужо за восемдзесят, што калісьці ў нашай вёсцы была вялікая свечка, якую пераносілі з хаты ў хату. Адбывалася гэта праз некалькі тыдняў пасля Вялікадня. Яна ахоўвала ад бяды, хваробы... Можа, вы што ведаеце пра гэты абрад? З павагай, чытачка газеты «Звязда» Марына П. з Гомельскага раёна».

Вясной 2004 года мы сталі сведкамі таго, як праводзілася набажэнства старавераў з нагоды святкавання Ушэсця ў вёсцы Пералёўка Веткаўскага раёна. У мясцовай традыцыі святочныя абрады першай паловы гэтага дня атрымалі назву «Вынас свечкі».

Адна з мясцовых жанчын паведаміла нам, што ў 1914 годзе кайзераўская армія спаліла мясцовую царкву і амаль што ўсю вёску. Пакуль царква гарэла, людзі паспелі забраць абразы і рознае храмавае начынне. Пасля вайны вёску адбудавалі, царкву — не. Тады людзі пачалі служыць малебен самастойна, у хаце якога-небудзь гаспадара. Так адзначалі практычна ўсе вялікія святы хрысціянскага календара. А падчас другой вайны маці загінулага хлопца зрабіла вялікую аброчную свечку і пачала прасіць людзей, каб яны сабраліся ў яе хаце і правялі малебен у памяць пра сына. З таго часу гэты абрад атрымаў назву «вынас свечкі», і адзначаецца ён кожны год якраз на Ушэсце — саракавы дзень пасля Вялікадня, у чацвер.

Малебен распачынаўся прыкладна ў дзевяць гадзін раніцы і доўжыўся да поўдня. На покуці ставілі аброчную свечку. Кожны, хто заходзіў у хату, нёс да яе свае свечкі, падарункі, пачастункі, грошы.

Аброчная свечка ўяўляла сабой невялікі скульптурны помнік. Яе выплаўлялі з воску, у таўшчыню яна мела не менш за пятнаццаць сантыметраў, а ў вышыню — да сарака. Свечку ставілі ў ступку накшталт вечка дзяжы, «адзявалі» ў спецыяльна пашытую «сукенку». Зверху павязвалі невялічкія «фартушкі», упрыгожаныя стужкамі, вышыўкай.

Кожны год упрыгажэнні свечкі абнаўлялі, таму з цягам часу яна станавілася ўсё таўсцейшая. Акрамя таго, на яе мацавалі маленькія свечкі, з якімі людзі прыходзілі на малебен, воск плавіўся і абцякаў, ад гэтага вялікая свечка станавілася яшчэ большая і цяжэйшая.

У хаце той жанчыны, якая зрабіла свечку ў памяць па загінулым сыне, яна знаходзілася амаль што сорак гадоў. Калі ж жанчына памерла, то аброчную свечку сталі пераносіць з хаты ў хату. Той гаспадар, у якога яна захоўвалася на працягу апошняга года, абавязкова рыхтаваў святочны стол-братчыну. Пасля малебна адбывалася святочнае сталаванне, затым адпраўляліся вадзіць карагоды і спраўляць абрад ваджэння стралы, а напрыканцы дня зноў ладзілі вячэру, на якой прымалася калектыўнае рашэнне, каму перадаць аброчную свечку на далейшае захаванне.

Трынаццаць гадоў свечка знаходзілася ў тым доме, у якім здарылася вялікая бяда: загінулі бацька і сын. Цяпер вось ужо трэці год яна «дапамагае» той сям'і, у якой бацька моцна запіў і аднойчы нават надумаў закончыць жыццё самагубствам, аднавяскоўцы вырашылі тэрмінова перанесці аброчную свечку менавіта ў гэту хату. Нягледзячы на тое, што галоўная свечка абшчыны знаходзіцца ў нейкім адным доме, да яе прыходзяць усе аднавяскоўцы, каб памаліцца і паставіць побач свае свечкі са сваімі ўласнымі просьбамі і пажаданнямі.

На думку многіх даследчыкаў, «свята свечкі» — гэта не што іншае, як трансфармацыя старажытных славянскіх свят, прысвечаных язычніцкім багам, якім прыносілі ахвярапрынашэнні ў выглядзе воску, мёду, піва ў надзеі на дабрабыт, шчасце, удачу на паляванні. Менавіта пра гэта сведчаць пісьмовыя крыніцы XII—XVII стст. Пасля прыняцця хрысціянства ахвяраванні ў выглядзе воску і мёду засталіся, толькі набылі дакладную акрэсленасць у выглядзе абраду, які ў гэтай мясцовасці завецца «Вынас свечкі».

Выбар хаты, у якой нейкі час захоўвалася свечка, залежаў ад многіх абставін. З аднаго боку, прысутнасць у хаце аброчнай свечкі накладвала на гаспадара і яго сям'ю дадатковыя патрабаванні. Гэта было вялікім гонарам, які трэба было заслужыць. З другога боку, перанос свечкі з хаты ў хату мог быць выкліканы нейкім няшчасцем, якое здаралася раптоўна. Акрамя гэтага, свечку не захоўвалі ў доме, у якім жылі кепскія, злыя людзі, тыя, хто часта лаяўся паміж сабой і з аднавяскоўцамі. Так абшчына выказвала сваё стаўленне да гэтай сям'і.

Сяляне былі глыбока перакананы, што невыкананне абраду «Вынас свечкі» можа наклікаць на вёску і яе жыхароў пракляцце, якое праявіцца ў выглядзе эпідэміі, падзяжу хатняй жывёлы, неўраджаю і г. д.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый ды абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска»

(в дополнение к ранее опубликованным декларациям в газете «Звязда» от 07.07.2015 г. № 126, от 20.11.2015 № 225, от 03.12.2019 № 229)

Застройщик – Коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 27.02.2014 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А, тел./факс: 361-67-99, 399-53-94.

Режим работы (приемное время): понедельник, среда – с 8.45 до 13.00; вторник, четверг – с 14.00 до 18.00; выходные дни: суббота, воскресенье.

Информация о проекте.

Проектом предусмотрено строительство встроенных помещений в составе объекта «Многоэтажный жилой комплекс со встроено-пристроенными помещениями административного, торгово-бытового назначения, гараж-стоянками и фирменным магазином-салоном РУП «Издательство «Белбланкавыд» по ул. Я. Мавра, 32А».

Предлагается для привлечения к строительству по договорам создания объектов долевого строительства: офисы №№ 7 – 15 с отдельным входом с открытой террасы. Площадь помещений: офис № 7 – 89,21 кв. метров; офис № 8 – 85,32 кв. метров; офис № 9 – 71,35 кв. метров; офис № 10 – 67,91 кв. метров; офис № 11 – 63,76 кв. метров; офис № 12 – 59,89 кв. метров; офис № 13 – 108,89 кв. метров; офис № 14 – 64,36 кв. метров; офис № 15 – 55,54 кв. метров.

Цена 1 кв. метра общей площади офиса на дату опубликования проектной декларации составляет 2 300,00 белорусского рубля.

Предполагаемый срок ввода – 1 июля 2020 года.

С планировками офисов и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А, к. 101, тел. 399-53-94.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор, для юридического лица – свидетельство о государственной регистрации организации, письмо о вступлении в долевое строительство с указанием реквизитов организации;

- быть готовым оплатить в течение 7 рабочих дней с даты регистрации договора в комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома 40 процентов стоимости объекта долевого строительства.

Указанная в настоящей проектной декларации цена 1 кв. метра общей площади офиса и количество офисов считаются действительными до момента опубликования новой декларации.

Даты | Падзеі | Людзі

27 МАЯ

У краіне

1900 год — нарадзіўся Уладзімір Адамавіч Жылка, беларускі паэт. Працаваў у газеце «Звязда», у Мінскім музычным тэхнікуме. Аўтар паэтычных зборнікаў «На ростані», «З палёў Заходняй Беларусі» і іншых. У 1930-м быў арыштаваны і высланы ў горад Уржум. Памёр у 1933-м. Рэабілітаваны ў 1960-м.

1930 год — нарадзіўся Валянцін Аляксеевіч Барысевіч, беларускі вучоны ў галіне ядзернай фізікі, кандыдат тэхнічных навук (1965). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986).

1935 год — нарадзіўся Уладзімір Георгіевіч Кудзінаў, беларускі пісьменнік. Працаваў у часопісе «Нёман». Аўтар зборнікаў аповесцяў і апавяданняў «Прадчуванне перамен», «Падзел радасці» і іншых.

1940 год — нарадзілася Тамара Рыгораўна Раеўская, эстрадная спявачка, заслужаная артыстка Беларусі (1974). У 1962–1992 гадах — салістка Дзяржтэлерадыё Беларусі.

2005 год — Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны перададзены на вечнае захоўванне факел з полымем, запаленым ад вечнага агню на Мамаевым кургане.

У свеце

1840 год — нарадзіўся Ларс Фрэдэрык Нільсан, шведскі хімік, які адкрыў у 1879-м хімічны элемент скандый.

1900 год — на парламенцкіх выбарах у Бельгіі ўпершыню ў свеце была выпрабавана сістэма прапарцыйнага прадстаўніцтва.

1905 год — 27–28 мая ў Карэйскім праліве каля вострава Цусіма адбылася марская бітва паміж 2-й Ціхаакіянскай эскадрай і японскім флотам, якая стала ключавым момантам для выніку руска-японскай вайны. Скончылася поўным паражэннем рускай эскадры. У баі загінула звыш пяці тысяч маракоў, з 28 расійскіх караблёў ацалелі тры. Пасля гэтага Расія была вымушана пачаць мірныя перагаворы, якія завяршыліся Портсмутскім мірам.

1930 год — амерыканец Рычард Дру запатэнтаваў празрыстую клейкую стужку. У верасні кампанія «3М» выпусціла яе ў продаж пад найменнем «скотч».

1960 год — нарадзіўся Аляксандр Мікалаевіч Башлачоў, расійскі паэт, рок-бард. Адзін з самых яркіх прадстаўнікоў савецкага андэграўнду.

1970 год — нарадзіўся Джозеф Файнс, брытанскі акцёр. Здымаўся ў фільмах «Закаханы Шэкспір», «Лютэр», «Венецыянскі купец» і іншых.

Так гаварыў...

Рыгор БАРАДУЛІН:
«Хто можа адказаць на пытанне: Дзеці —
незаслужаная ўзнагарода
Ці заслужанае пакаранне?»

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 22 мая.
Месяц у сузор'і Льва.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.49	21.25	16.36
Віцебск	4.32	21.22	16.50
Магілёў	4.39	21.15	16.36
Гомель	4.44	21.03	16.19
Гродна	5.06	21.39	16.33
Брэст	5.15	21.31	16.16

Імяніны

Пр. *Максіма, Мікіты, Нікіфара, Сідара.*
К. *Магдалены, Аўгусціна, Юльяна, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Калі вы стаміліся сядзець склаўшы рукі, прыляжце.

Тупыя людзі як тупыя нажы. Нібыта і шкоды прычыніць не могуць, але бесяць!

Ніколі не еш апошнюю катлету з патэльні. Адной катлетай не наясіся, а патэльню давядзецца мыць!

Жанчыны ніколі не старэюць — гэта ў мужчын зрок псуецца.

Працую ў турагенцтве. Турысты СМС даслалі: «Дзякуй! Нам так класна ў Турцыі!..»
Напісаць ім, што яны ў Егіпце, ці не трэба?

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1449.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 мая 2020 года.